УДК 37.01(075.8)

**В.Ц. Чэпікаў, Е.В. Цытко**

# Маральнае выхаванне як мэтанакіраваны працэс сацыялізацыі і індывідуалізацыі асобы

Выхаванне як адзін з відаў сацыяльнай дзейнасці людзей прызвана дапамагчы падрастаючаму чалавеку авалодаць сацыяльным вопытам, «прысвоіць» яго і такім чынам падрыхтавацца да жыцця ў грамадстве. З гэтага можна зрабіць вывад аб тым, што выхаванне асобы з'яўляецца працэсам яе мэтанакіраванай *сацыялізацыі*, асноўны сэнс якой зводзіцца да таго, што засваенне сацыяльнага вопыту, набытага грамадствам у ходзе гістарычнага развіцця, забяспечвае падрыхтоўку да жыцця падрастаючага чалавека і фарміраванне яго адносін да навакольнай рэчаіснасці.

У філасофіі пад сацыялізацыяй разумеюць працэс засваення чалавечым індывідам пэўнай сістэмы ведаў, норм і каштоўнасцей, якія дазваляюць яму функцыянаваць у якасці паўнапраўнага члена грамадства, а ў сацыяльна-этычных даследаваннях паняцце сацыялізацыі разглядаецца як агульны механізм сацыяльнай эвалюцыі чалавека і ператварэння яго ў сацыяльную істоту.

Адсюль вынікае, што сутнасць педагагічнага аспекту сацыялізацыі асобы заключаецца ў мэтанакіраванай падрыхтоўцы чалавека да выканання сваіх асноўных сацыяльных функцый, яго асобасным фарміраванні. «Сацыялізацыя, – падкрэсліваў Б.Ц. Ліхачоў, – ёсць самая агульная і абстрактная катэгорыя, якая паказвае працэс уключэння біясацыяльнага індывіда, які расце і развіваецца, ва ўзаемадзеянні з сацыяльнымі сістэмамі, навакольным асяроддзем, іншымі індывідамі, дзякуючы чаму адбываецца з большай або меншай ступенню паўнаты станаўленне асобы» [1].

Неабходна адзначыць, што ў педагагічных даследаваннях феномен сацыялізацыі не падвяргаўся дэталёваму навуковаму аналізу, а само паняцце як навуковая катэгорыя ўжываецца вельмі рэдка.

Маральнае выхаванне таксама можна разглядаць як арганізаваны грамадствам працэс авалодання падрастаючымі пакаленнямі сацыяльным маральным вопытам з мэтай іх падрыхтоўкі да жыцця ў грамадстве, або іх ***маральнай сацыялізацыі***. Прадстаўленне аб маральным выхаванні як працэсе маральнай сацыялізацыі асобы з'яўляецца адным з найважнейшых агульнатэарэтычных арыенціраў, які дазваляе раскрыць навуковы падыход да разумення яго сацыяльнай сутнасці, сацыяльных крыніц і механізмаў.

Крыніцай маральнай сацыялізацыі асобы з'яўляецца сацыяльны маральны вопыт, які называецца грамадскай мараллю. Ён уключае ў сябе не толькі вопыт сучаснага чалавецтва, але і абагульнены вопыт шматлікіх пакаленняў людзей. Грамадская мараль прадстаўляе сабой сукупнасць маральных норм і прынцыпаў, якія рэгулююць адносіны людзей у грамадстве, стымулююць або стрымліваюць іх паводзіны і дзейнасць. Маральныя нормы і прынцыпы высту-

паюць як сацыяльныя прадпісанні, патрабаванні і правілы, якія прад'яўляюцца грамадствам да сваіх членаў. Яны акрэсліваюць і рэгламентуюць паводзіны і дзейнасць чалавека, змяшчаюць мадэль яго маральных адносін да прыроды і грамадства, яго ўзаемаадносін з іншымі людзьмі. З'яўляючыся адносна незалежнымі ад штодзённага вопыту канкрэтнага індывіда, маральныя нормы і прынцыпы як бы замацоўваюць тое, што ўжо ёсць ў грамадстве, і накіраваны на фарміраванне таго, чым павінен авалодаць кожны чалавек. Справа ў тым, што ў маральных нормах і прынцыпах змяшчаюцца прыклады маральных адносін чалавека, зыходзячы з якіх грамадства ацэньвае яго паводзіны і дзеянні. Менавіта сістэма маральных норм і ацэнак, якія рэгулююць адносіны чалавека, дазваляе рэалізаваць сацыяльныя механізмы ўздзеяння грамадства на паводзіны і дзейнасць асобы, на фарміраванне яе маральнасці.

Уступіўшы ў сістэму даступных маральных адносін і арыентуючыся на маральныя прыклады дзейнасці і паводзін, якія змяшчаюцца ў маральных нормах і прынцыпах, падрастаючы чалавек засвойвае іх і такім чынам уключаецца ў грамадскае жыццё і фарміруецца маральна.

Зразумела, што змест паняцця маральнай сацыялізацыі з'яўляецца больш шырокім, чым змест паняцця маральнага выхавання. Маральная сацыялізацыя як працэс авалодання індывідам гістарычна ўсталяваўшагася сацыяльнага маральнага вопыту змяшчае ўвесь комплекс вонкавых уздзеянняў на асобу, як стыхійна дзейнічаючых уплываў навакольнага асяроддзя, так і мэтанакіраваных, спецыяльна арганізаваных педагагічных уздзеянняў.

Аднак стыхійная сацыялізацыя не забяспечвае выхаванне ўсіх тых маральных якасцей, якія неабходны чалавеку для жыцця ў грамадстве. Сувязі і адносіны, у якія ўступае падрастаючы чалавек у працэсе сваёй жыццядзейнасці, маральныя прыклады, заключаныя ў гэтых адносінах, бываюць як пазітыўнымі, так і негатыўнымі, нярэдка адлюстроўваюць асацыяльны вопыт паводзін і дзейнасці людзей. Таму «сацыялізацыя дзіцяці, увесь працэс пераўтварэння яго з арганізма ў псіхалагічна сталага і маральна паўнацэннага члена грамадства павінен ажыццяўляцца пад кантролем выхавання. Менавіта яно і ёсць актыўнае і мэтанакіраванае кіраўніцтва фарміраваннем асобы» [2].

Калі прыняць да ўвагі той факт, што выхаваўчая дзейнасць настаўнікаў і бацькоў мае на сваёй мэце яшчэ і ліквідацыю негатыўнага ўплыву на школьнікаў стыхійных уздзеянняў навакольнага асяроддзя, недахопаў у іх дзейнасці і паводзінах, то ў гэтым выпадку з пэўнай доляй умоўнасці можна дапусціць, што маральнае выхаванне ёсць педагагічны працэс маральнай сацыялізацыі школьнікаў, накіраваны на арганізацыю засваення імі сацыяльнага маральнага вопыту і ажыццяўлення іх маральнай падрыхтоўкі, дзякуючы гэтаму і адбываецца ўключэнне асобы падрастаючага чалавека ў сістэму даступных яму грамадскіх адносін і фарміраванне яго маральнасці.

Сукупнасць маральных адносін, што характарызуюць узаемасувязі вучняў з навакольным асяроддзем і іншымі людзьмі, з'яўляецца тым сацыяльным зместам, які ў працэсе выхавання аб'ектыўна прысвойваецца імі і вызначае іх маральную сутнасць. Таму, на думку І.С. Мар'енкі, «пры аналізе рэальнага працэса выхавання неабходна звяртаць увагу на вывучэнне маральных адносін, таму як сацыяльная сутнасць школьніка вызначаецца тымі адносінамі, у якія вучань уступае ў працэсе дзейнасці і адносін. У сістэме маральнага выхавання такі падыход павінен быць асноўным» [3].

Такі падыход, на нашу думку, як і паняцце маральнай сацыялізацыі, адлюстроўвае толькі ***сацыяльны аспект*** працэса маральнага выхавання і дазваляе раскрыць сацыяльныя механізмы яго ажыццяўлення. Апошнія вызначаюцца тымі грамадскімі ўплывамі і педагагічнымі ўздзеяннямі, якія дапамагаюць уключыць дзяцей у жыццё грамадства ў якасці маральна паўнацэнных членаў. Ад-

нак было б памылкова лічыць, што сацыяльныя ўплывы і педагагічныя ўздзеянні, якія дзейнічаюць на асобу, механічна прымушаюць яе падпарадкоўвацца маральным патрабаванням, правілам і нормам, засвойваць сацыяльны маральны вопыт і вызначаюць фарміраванне яе маральнасці. Справа ў тым, што, з'яўляючыся аб'ектыўнай крыніцай маральнай падрыхтоўкі падрастаючага чалавека, маральны вопыт непасрэдна не вызначае маральнае фарміраванне яго асобы, а з'яўляецца толькі перадумовай гэтага працэсу.

Фарміраванне маральнасці школьнікаў адбываецца перш за ўсе ў сацыяльным асяроддзі, у працэсе іх удзелу ў разнастайных відах дзейнасці і адносін, у іх учынках і дзеяннях, а таксама ў той унутранай перапрацоўцы, якая ажыццяўляецца вакол працэсу засваення сацыяльнага маральнага вопыту асобаю, яго пераводам з аб'ектыўнай грамадскай з'явы ў суб'ектыўны яе здабытак. Пры гэтым засваенне сацыяльнага маральнага вопыту шмат у чым абумоўліваецца ўзроўнем маральнай свядомасці дзіцяці, залежыць ад таго, як гэты вопыт яно ўспрымае і асэнсоўвае. Таму для педагагічнай тэорыі і выхаваўчай практыкі асаблівае значэнне мае ***асобасны аспект*** маральнага выхавання, які адлюстроўвае сутнасць асобасна арыентаванага падыходу да працэсу выхавання маральнасці школьнікаў. Гэты падыход у айчыннай псіхалогіі сфармуляваны як асобасны прынцып, які патрабуе даследаваць псіхічныя ўласцівасці і якасці як уласцівасці і якасці асобы.

Прынцып асобасна арыентаванага падыходу да маральнага выхавання не толькі выяўляе становішча вучня ў выхаваўчым працэсе, але і прызнае яго актыўным суб'ектам гэтага працэсу. Ён дазваляе ахарактарызаваць тыя ўнутраныя псіхалагічныя змены, якія адбываюцца пад ўздзеяннем засваення сацыяльнага вопыту ў саставе і структуры маральнай сферы асобы, фарміраванні яе маральных якасцей.

Пераход сацыяльных маральных адносін ва ўнутраны псіхалагічны план асобы, у яе маральныя якасці ў этыцы атрымаў назву персаніфікацыі адносін, пад якой разумеюць «...*складаны і супярэчлівы працэс узаемадзеяння інфармацыйнага зместу сацыялізуючых і рэгулюючых паводзіны асобы фактараў з рознымі тыпамі свядома-псіхічных і ідэалагічных працэсаў, уласцівасцей, адносін, якія ўтвараюць цэласны модус чалавека* (патрэбнасці, інтарэсы, перакананні, ацэначныя крытэрыі, імкненні)» [4].

Паняцце персаніфікацыі дазваляе раскрыць унутраныя механізмы ажыццяўлення маральнай сацыялізацыі асобы. Яно азначае *«працэс пераводу разнастайных выхаваўчых уплываў, якія ажыццяўляюцца школай і яе рознымі падраздзяленнямі ў сістэме ўрочных заняткаў і пазакласнай працы, у фактар індывідуальнага развіцця і фарміравання вучняў»* [5].

Аднак у псіхалагічнай і педагагічнай навуках паняцце персаніфікацыі не атрымала шырокага распаўсюджання. Часцей асобасны аспект фарміравання чалавека абазначаецца паняццем ***індывідуалізацыі***. «З аднаго боку, – адзначаў Б.Ф. Ломаў, – асоба ўсё больш поўна ўключаецца ў сістэму грамадскіх адносін; яе сувязі з людзьмі і рознымі сферамі жыцця грамадства пашыраюцца і паглыбляюцца; і толькі дзякуючы гэтаму яна мае магчымасць авалодаць грамадскім вопытам, прысвоіць яго, зрабіць сваім здабыткам. Гэты бок развіцця асобы часцей вызначае яе сацыялізацыю. З другога боку, далучыўшыся да розных сфер жыцця грамадства, асоба разам з тым набывае і ўсё большую самастойнасць, адносную аўтаномнасць, гэта значыць яе развіццё ў грамадстве ўключае працэс індывідуалізацыі. Індывідуалізацыя – гэта фундаментальны феномен грамадскага развіцця чалавека. Адна з яго прыкмет (і паказчыкаў) заключаецца ў тым, што ў кожнай асобы фарміруецца яе асабісты (і унікальны) вобраз жыцця і асабісты ўнутраны свет» [6].

Змест паняцця індывідуалізацыі ўключае не толькі тыя індывідуальныя марапьна-псіхалагічныя перамены, якія адбываюцца ва ўнутранай сферы асобы ў выніку засваення ёй сацыяльнага маральнага вопыту, але і вонкавыя суб'ектыўныя праяўленні гэтых перамен у яе паводзінах і дзейнасці.

Феномен індывідуалізацыі вызначае сутнасць асобасна арыентаванага падыходу да маральнага выхавання і дазваляе раскрыць псіхалагічныя механізмы пераўтварэння педагагічных уздзеянняў і ўплываў у фактар індывідуальнага фарміравання асобы. Вынікам працэсу індывідуалізацыі выступаюць ***маральныя якасці***, якія з'яўляюцца ўнутранымі передумовамі індывідуальнасці асобы і абумоўліваюць своеасаблівасць яе вонкавых праяўленняў.

У працэсе выхавання школьнікі засвойваюць не сацыяльныя маральныя адносіны, а звязаныя з імі веды аб правілах, нормах і прынцыпах паводзін чалавека ў грамадстве, і на гэтай падставе адбываецца фарміраванне іх пэўных матываў і звычак паводзін. «Якасць асобы, – сцвярджала Л.І. Бажовіч, – па сутнасці, і з'яўляецца вынікам устойліва замацаванай звычкі» [2, с. 183]. Сфарміраваўшыся ва ўнутранай сферы асобы маральныя якасці ў далейшым вызначаюць яе паводзіны і дзейнасць, характар адносін да навакольнай рэчаіснасці. «Узнікнуўшы як засваенне пэўных форм паводзін, – зазначала Л.І. Бажовіч, – устойлівыя якасці асобы ў сваю чаргу, у парадку адваротнага ўплыву, пачынаюць вызначаць паводзіны дзіцяці, яго дзейнасць, характар яго ўзаемаадносін з акружаючымі людзьмі» [7].

Адсюль вынікае, што асноўным механізмам унутранай індывідуалізацыі асобы, засваення ёю сацыяльнага маральнага вопыту і яго пераводу ў індывідуальна-суб'ектыўную форму існавання (маральныя якасці), выступае працэс інтэрыярызацыі. «Фарміраванне асобы шляхам інтэрыярызацыі – прысваення прадуктаў грамадскага вопыту і культуры ў працэсе выхавання і навучання, – адзначаў Б.Г. Ананьеў, – ёсць разам з тым засвойванне пэўных пазіцый, ролей і функцый, сукупнасць якіх характарызуе яе сацыяльную структуру» [8].

Працэс экстэрыярызацыі, г. зн. «аб'ектывізацыі назапашанага *асобай вопыту* як увасабленне ў практычнай *дзейнасці* і ў прадметных *дзеяннях* задум, планаў і ўменняў шляхам пераходу ўнутраных, раней *інтэрыярызаваных дзеянняў* у знешнія» [9], вызначае механізм вонкавай індывідуалізацыі асобы. Выхаваўчыя ўплывы і ўздзеянні пры пераходзе ва ўнутраны свет чалавека набываюць псіхалагічную форму існавання, а потым праз сістэму вонкавых дзеянняў і ўчынкаў, маральных адносін праяўляюцца ў яго паводзінах і дзейнасці. Індывідуальнымі з'яўляюцца не толькі маральныя якасці як кампаненты маральна-псіхалагічнай сферы асобы школьніка, але і іх праяўленні ў яго паводзінах і дзейнасці, у адносінах да навакольнага асяроддзя. Феномен індывідуалізацыі адлюстроўвае асобасны бок маральнасці чалавека і з'яўляецца вынікам узаемадзеяння двух супрацьлеглых працэсаў: інтэрыярызацыі і экстэрыярызацыі. Прынцып інтэрыярызацыі-экстэрыярызацыі дазваляе раскрыць механізмы засваення асобаю сацыяльнага маральнага вопыту і паказаць, як дзякуючы гэтаму адбываецца яе псіхічнае развіццё і арганізацыя паводзін і дзейнасці.

Прадстаўленне аб маральных якасцях як псіхалагічных фарміраваннях маральнай сферы асобы вызначае галоўны агульнатэарэтычны падыход да навуковай распрацоўкі тэарэтычных асноў і рашэння практычных праблем выхавання. Гэты падыход паказвае, што маральныя якасці выступаюць як мэта і вынік выхавання, а тыя маральна-псіхалагічныя змяненні, якія ў гэтым працэсе адбываюцца ва ўнутранай маральна-псіхалагічнай сферы асобы, з'яўляюцца галоўнымі паказчыкамі яе маральнасці, абумоўліваюць характар маральных адносін, накіраванасць паводзін і дзейнасці. Таму пры ажыццяўленні працэсу маральнага выхавання неабходна ствараць пэўныя выха-

ваўчыя ўмовы, пры якіх вонкавыя выхаваўчыя ўздзеянні і ўплывы пераходзілі б ва ўнутраны псіхалагічны план асобы і садзейнічалі б фарміраванню яе маральных якасцей.

Такім чынам, маральнасць асобы школьніка як сукупнасць маральных якасцей прадстаўляе сабой антагенетычны здабытак, з'яўляецца вынікам складаных дыялектычна ўзаемазвязаных працэсаў маральнай сацыялізацыі і індывідуалізацыі. Першы з іх адлюстроўвае сацыяльную сутнасць маральнага выхавання і адзін з бакоў маральнасці асобы – яе сацыяльнасць; другі – асобасную сутнасць маральнага выхавання і другі бок маральнасці – яе індывідуальнасць.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Лихачев Б.Т.*** Философия воспитания. – М., 1995. – С. 30.
2. ***Божович Л.И.*** Избранные психологические труды. Проблемы формирования личности. – М., 1994. – С. 58.
3. ***Марьенко И.С.*** Нравственное становление личности школьника. – М., 1985. – С. 82.
4. ***Момов В.*** Человек, мораль, воспитание. – М., 1975. – С. 54.
5. ***Харламов И.Ф.*** Педагогика. Курс лекций. – Мн., 1979. – С. 264.
6. ***Ломов Б.Ф.*** Методологические и теоретические проблемы психологии. – М., 1984. – С. 307–308.
7. ***Божович Л.И.*** Личность и ее формирование в детском возрасте. – М., 1968. – С. 346–347.
8. ***Ананьев Б.Г.*** Психология и проблемы человекознания. – М., 1996. – С. 254.
9. ***Платонов К.К.*** Краткий словарь системы психологических понятий. – М., 1984. – С. 169.



## *SUMMARY*

*The mechanisms of the process of moral education are revealed through the rising generations mastering of the social spiritual experience as a result their moral training for their life in the society (socialization) takes place and the personality forming (individualization) realized.*


*Поступила в редакцию 26.11.2004*